

магілёўскі

Выбар

№ 20
Лістапад
2012 г.

Абласная Дэмакратычная Трыбуна

ХТО СКРАЎ ГРОШЫ НА БУДАЎНІЦТВА ЛЯДОВАГА ПАЛАЦА Ў ШКЛОВЕ?



Выступаючы 1 лістапада на паседжанні выканкама Нацыянальнага алімпійскага камітэта, А.Лукашэнка запатрабаваў выкаранення фінансавых і іншых парушэнняў дысцыпліны ў сферы спорту і заявіў аб недапушчэнні фактаў карупцыі.

А яшчэ раней, 26 кастрычніка, на сходзе Нацыянальнага алімпійскага камітэта ён паабяцаў надзець кайданкі на некаторых функцыянераў ад спорту, хто, па яго меркаванню, нажываўся на беларускім спорце, будуючы катэджы...

Па сведчаннях прадстаўнікоў беларускіх уладных структураў, у нашай краіне сфармавана непрымірымая пазіцыя дзяржавы па супрацьдзеянню карупцыі і яе злачынным праявам. У апошнія гады на дзяржаўным узроўні прыняты шэраг законаў і праграм, скіраваных на барацьбу з гэтай негатыўнай з'явай.

Гэта, перш за ўсё, закон "Аб барацьбе з карупцыяй", які ўступіў у сілу ў студзені 2007 года.

У 2007-2010 гадах у Беларусі рэалізоўвалася Дзяржаўная праграма па барацьбе з карупцыяй на 2007-2010 гады.

У верасні 2010 года зацверджана Дзяржаўная праграма па барацьбе са злачынствамі і карупцыяй на 2010-2012 гады.

Дзеля выканання указа прэзідэнта ад 17.12.2007 № 644, у сталіцы створаны цэлы штаб па барацьбе са злачынствамі і карупцыяй, старшынём якога з'яўляецца пракурор горада Мінска...

Але, нягледзечы на, здаецца, актыўныя меры з боку ўладаў, карупцыя ў краіне разрастаецца непамернымі крокамі. Ужо і сфера спорту па ацэнцы карупцыйнага складніка збілізілася з найбольш карумпаванымі галінамі вытворчасці. Такімі, як будаўніцтва, перапрацоўка, сельская гаспадарка.

Толькі, напрыклад, у сферы будаўніцтва, не кажучы ўжо пра іншыя, за 2010 год, па заключэнню сілавых структураў, каля 730 міліярдаў рублёў бюджэтных грошай былі выведзены ў нелегальны абарот (скрадзены). А гэта перавышае нават агульны кошт такога аб'екта, як "Мінск-Арэна", уведзены ў строй напачатку 2010 года.

І колькі ж можна было бы пабудаваць толькі за гэтыя сродкі новых лядовых палацаў, іншых спартыўных аб'ектаў, будаўніцтва якіх было запланавана ў разнастайных гарадах краіны. Такіх, напрыклад, як лядовая арэна на 280 месцаў у горадзе Шклове.

(Заканчэнне на стар. 2)

ЖУРНАЛІСТЫ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ ПАДТРЫМАЛІ АКЦЫЮ "СТАНЕМ ЗА ЖУРНАЛІСТЫКУ"



5 лістапада ў Магілёве ў памяшканні грамадскага цэнтра "Кола" сабраліся журналісты з розных рэгіянальных выданняў Магілёўскай вобласці, каб прыняць удзел у міжнароднай акцыі салідарнасці "Станем за журналістыку!" і падтрымаць сваіх калег, якія пераследуюцца за сваю прафесійную дзейнасць.

Удзел у сустрэчы прынялі дваццаць сяброў ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" з сямі раёнаў Магілёўскай вобласці і горада Магілёва. Прысутныя выказалі сваю падтрымку калегам Андрэю Пачобуту і Валерыю Булгакаву, якія падвяргаюцца ўціску за сваю журналісцкую дзейнасць і рэдакцыі часопіса "ARHE", выданне якога зараз знаходзіцца пад пагрозай спынення. Таксама журналісты паставілі свае подпісы пад лістамі на адрас Адміністрацыі прэзідэнта, Міністэрства інфармацыі, кіраўніцтва Беларускага тэлебачання і дэпартамента фінансавых расследванняў з патрабаваннем спыніць пераслед часопіса "ARHE" і незалежных журналістаў.

Таксама ў межах сутрэчы журналістаў Магілёўшчыны адбылася прэзентацыя супольнага выдання "Збажына", адмыслова

(Заканчэнне на стар. 2)

ХТО СКРАЎ ГРОШЫ НА БУДАЎНІЦТВА ЛЯДОВАГА ПАЛАЦА Ў ШКЛОВЕ?

(Заканч. Пачатак на стар. 1)

Будаўніцтва лядовага палаца ў Шклове было распачата ў другім квартале 2010 года, і планавалася, што аб’ект будзе зданы ў эксплуатацыю ў 2011 годзе. Пад будаўніцтва арэны адведзена самае маляўнічае месца на беразе Дняпра, дзе раней шматлікія шклаўчане бавілі свой вольны час.

На прылеглай да палаца тэрыторыі планавалася будаўніцтва летняга амфітэатра, лыжаролернай трасы, пляжа, выратавальнай станцыі, прычала для турыстычнага цеплахода і іншых пракатных плаўсродкаў для прагулак па Дняпры.

Праектны кошт будаўніцтва аб’екта на пачатку яго ўзвядзення складаў каля 50 млрд. рублёў.

Прайшоў час, на зыходзе ўжо 2012 год, а пра завяршэнне будаўніцтва палаца і не варта гаварыць, бо работы замарожаны на этапе падрыхтоўкі пляцоўкі з-за адсутнасці фінансавых сродкаў.

Месца, дзе раней гараджане нярэдка адпачывалі, зараз нагадвае палігон для выпрабавання цяжкай вайсковай тэхнікі.

Жыхары Шклоўшчыны ўжо і спадзявацца перасталі, што калісці лядовая арэна будзе пабудавана, і шкадуюць аб сапсаваным маляўнічым месцы на беразе ракі.



Не можа адказаць на пытанне аб лёсе лядовага палаца кіраўніцтва мясцовага райвыканкама.

Маўчыць і А.Лукашэнка. Бо сітуацыю з будаўніцтвам лядовай арэны ён назіраў у час адкрыцця рэканструяванага аўтамабільнага маста праз раку Днепр у Шклове 6 ліпеня 2012 года.

Ды што тут скажаш...

І толькі як грыбы пасля дажджу растуць шыкоўныя катэджы разнастайных беларускіх чыноўнікаў ад спорту, ад сферы будаўніцтва, сельскай гаспадаркі... І растуць не толькі ў Беларусі, а і па-за межамі нашай краіны.

Рыгор Кастусёў

ЖУРНАЛІСТЫ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ ПАДТРЫМАЛІ АКЦЫЮ “СТАНЕМ ЗА ЖУРНАЛІСТЫКУ”

(Заканч. Пачатак на стар. 1)

падрыхтаванага да акцыі “Станем за журналістыку”. У “Збажыне” магілёўскія журналісты распавялі пра тое, якія цяжкасці даводзіцца пераадольваць ім для атрымання неабходнай інфармацыі з уладных структураў, а таксама аб праследзе рэгіянальных выданняў з боку пільных ідэалагічных і праваахоўных органаў.

Сябра “Беларускай асацыяцыі журналістаў” з Магілёва Генадзь Суднік выказаў меркаванне, што рэгіянальныя журналісты з незалежных выданняў Магілёўшчыны стаяць за журналістыку штодня, сумленна робячы сваю справу і даносячы вольнае слова да сваіх чытачоў.

Барыс Вырвіч

На Новы год будуць чатыры выхадныя запар

Савет міністраў прыняў пастанову пра перанос працоўных дзён у снежні 2012 года і ў 2013 годзе.

Так, працоўны дзень з панядзелка 24 снежня 2012 года пераносіцца на суботу 22 снежня гэтага года. На Новы год пераносаў будзе больш. З панядзелка 31 снежня працоўны дзень пераносіцца на суботу 29 снежня. А ў 2013 годзе замест серады 2 студзеня працоўнай будзе субота 5 студзеня.

Таксама з пятніцы 10 траўня працоўны дзень пераносіцца на суботу 18 траўня 2013 года, паведамляе БЕЛТА.

«Навагодні падарунак» беларусам: будзе чарговы скачок коштаў

З 1 студзеня 2013 г. павышаюцца акцызы на алкаголь, цыгарэты і паліва.

Стаўкі акцызаў на аўтамабільны бензін і дызельнае паліва з 1 студзеня 2013 г. пабольшаюць у сярэднім на 20 %.

Павысяцца стаўкі акцызаў на віно (33 %), на піва (12 %), спірт (34 %) ды іншыя віды алкагольнай прадукцыі.

Яшчэ больш вырастуць акцызы, а значыць, і кошты на тытунёвыя вырабы. Паводле новых нормаў, стаўкі акцызаў на цыгарэты павысяцца ў 1,5–3,5 разу.

ЗА ОБРАЗОВАНИЕМ НА АВТОБУСЕ

Во многих американских фильмах в кадре нередко появляется автобус жёлтого цвета. На дорогах и улицах Америки это привычный и, можно сказать, непременный участник дорожного движения. Весь мир знает, что в таких автобусах возят на уроки и с уроков школьников. Делается это в целях обеспечения безопасности, отсюда и хорошо заметный жёлтый цвет. Он предупреждает всех остальных водителей — будь предельно осторожен, в автобусе находятся дети! Как правило, школьников забирают и высаживают непосредственно возле своего дома. В общем, в который раз убеждаешься, что нам есть чему поучиться у цивилизованных стран.



Конечно, и в Беларуси учащихся школ доставляют на учёбу автобусами. Но связано это не с безопасностью учеников, а совсем с другими причинами. Сегодня каждая пятая белорусская школа имеет наполняемость до 50 учащихся. Во многих из них учатся дети из всех близлежащих деревень. И поэтому на занятия школьников привозят автобусами, для чего ежедневно по всей стране задействуют 1200 автобусов. Но наполняемость классов зависит всё-таки не от транспортного обслуживания, а от рождаемости. В итоге с каждым годом на занятия привозят всё меньше сельских детей.

За последние несколько лет к демографическим проблемам добавились финансовые. Сейчас власти даже не скрывают, что расплачиваться за бездумную экономическую политику государства придётся, в первую очередь, тем, кто находится на государственном содержании. В связи с этим заявлено о предстоящих бюджетных реформах, которые сводятся к изменению принципов финансирования социальной сферы. Особенно эти изменения коснутся образования и здравоохранения.

Например, Министерство финансов РБ подсчитало, что если в Европе на одного преподавателя приходится более 11 учеников, то у нас — менее девяти. По расчётам Минфина это приводит к тому, что на содержание бюджетной сети учебных заведений Беларуси приходится тратить больше средств в сравнении с европейскими государствами. Вывод — необходимо сокращать госрасходы и оптимизировать количество учебных заведений.

Трудно поверить, что у нас на школы тратят больше средств, чем в Европе. Согласиться можно только с тем, что и нынешнее скудное содержание белорусского образования давно не по силам прохудившейся государственной казне. Вот подтверждающий пример из жизни Климовичского района. В 2010 году, то есть ещё за год до обвальной девальвации, было принято решение о закрытии начальной школы в деревне Павловичи. Тогдашний руководитель отдела образования Климовичского райисполкома Татьяна Марус рассказала областным СМИ, что в Павловичской школе почти на каждого школьника приходилось по работнику, которому надо было платить зарплату (учителя, кухня и т. д.). Татьяна Марус объяснила: «Содержание одного ребенка обходилось здесь государству более чем в 6 млн. рублей в год, что гораздо выше, чем в обычных школах. А на нынешний учебный год, по-моему, ещё большая цифра «выскакивала». Поэтому школу закрыли, а учеников стали возить на автобусе в Климовичи в городскую СШ №3.

На тот год в районе для подвоза сельских детей к школам использовали 7 автобусов. А теперь появились веские основания считать, что в ближайшем времени школьный автопарк придётся существенно увеличить. Во-первых, школы на Климовщине закрывались и после 2010 года. Во-вторых, и это главное, ещё только предстоящие бюджетные реформы уже стали отражаться на положении образовательной системы района. Первоначально планировалось, что весной 2013 года будут закрыты одна или две школы. У нас есть информация, что Климовичский РОО получил указание готовить закрытие сразу пяти сельских школ. Среди наиболее

(Начало. Оконч. на стр. 4)

НАБАЛЕЛА...

Так і хочацца “выразиться”: ЁПРСТ! Не. Хочацца крыкнуць! Ды што-небудзь такое ёмістае! Ды на ўсю моц! Ды на ўсю акругу! Каб уздрыганулася ўсё наваколле!!! А што толку? Усё роўна мясцовае начальства не пачуе. А вышэйшае – тым больш…

Ніхто, мабыць, сёння не стане спрачацца з той акалічнасцю, што самае бойкае месца ў Чэрыкаве зараз – крама “Дабраном”. Гэта як раней была “Чайханэ” - так звалі мясцовую сталовую, каля якой людзі таўпіліся да таго часу, пакуль яна не закрывалася.

Наогул кут вуліц Калініна-Касманаўтаў зараз вельмі звонкі ў тым сэнсе, што шматлюдны. Тут знаходзяцца два пяціпавярховых інтэрнаты. Нядаўна пабудавалі і засялілі жылы дом на пяць узроўняў. Плюс прыватны сектар. І даволі шчыльны. Так што насельніцтва тут ёсць. І шмат. Здавалася б, і ўсё астатняе для яго функцыянавання таксама ёсць. Непадалёк ад крамы “Доброном” знаходзіцца крама “Універсам” разам з барам-дыскатэкай. Далей па вуліцы Калініна на невялікай адлегласці адзін за адным – шапік харчовых тавараў “Вояж”, крама “Водар” (гэтаксама – ўсё для страўніка), “Перекрёсток” (выпіць, закусіць). І па логіцы рэчаў становіцца зразумела, што пасля працы на гэтым участку пачынаецца броўнаўскі рух. Да гэтай кругаверці дабаўце яшчэ нямалую колькасць жыхароў мікраараёна па вул. Ракасоўскага ды па вул. Калініна. Намалявалі сабе карцінку? А зараз уявіце сабе, што увесь гэты натоўп рухаецца ў цемры. Вулічнае асвятленне, менавіта, на вул. Калініна ўключаецца ў 18 гадзінаў 20 хвілінаў. Людзі з працы зайшлі ў гандлёвыя кропкі, пакуль там тое-сёе прыдбалі і дамоў топайце навобмацак. Хаця, трэба аддаць належнае, гэтая вуліца асветлена не хужэйшым чынам. Толькі вось кнопку выключальніка націскаюць пазнавата. Усё эканомім. На людзях.

Мімаходам, калі ўжо гамонка зайшла пра асвятленне горада, немагчыма не сказаць некалькі слоў аб тым, як выглядае ў гэтым сенсе зусім не перыферыйная вуліца Камсамольская, па якой шамацяць шынамі аўтобусы і ў сталіцу “квітнеючай” Беларусі, і ў абласныя цэнтры, і ў іншыя буйныя гарады нашай краіны. Калі на Касманаўтаў там-сям яшчэ віднеюцца пару лямпачак, то на вышэй названай вуліцы крыніцу святла можна ўбачыць хіба што ў бінокль. І гэткая сітуацыя цягнецца ўжо не адзін год (дзіўна толькі, як гэтага не заўважае наш старшыня райвыканкаму спадар Кадаценка Мікалай Міхайлавіч). І людзям прыходзіцца браць ваду са студні, якая карыстаецца вялікім попытам у насельніцтва, ў цемры. Асаблівая нязручнасць з’яўляецца зімою, калі ноч падсоўваецца вельмі рана, вакол студні нарастае лёд. Ды і бяз гэтай з’явы хапае праблем. Цемра – яна і ў Афрыцы цемра.

Каля крамаў “Універсам” з барам ды “Дабраном” - яшчэ больш крута. Тут наогул няма ніякага асвятлення. Нават пад асабістымі нагамі нічога нябачна. Хаця ліхтар на слупу каля “Добронома” і вісіць, але ён “зажмурыў сваё вока” даўным-даўно. І невядома, калі і хто заставіць яго зіхацець яркім святлом на радасць людзям. А тым часам з крамы выходзіш на прыступкі з поўнымі сумкамі, а на вуліцы - як у чорнаскурага чалавека ў самым глыбокім месцы ў дванаццаць гадзін ночы (хай чытач выбачае мяне за такое “лагоднае” параўнанне – цярпець ужо няма моцы, бо ўсё гэта адчуў на сябе). Вось тут паміж волі і з’яўляецца “натхненне” грымнуць, мякка кажучы ды цвёрда выражаючыся, сакавітым трохпавярховым (а мо і шматпавярховым). Накшталт: ангідрыд тваю перакісь марганца няхай стане з закіссю вадарода! Бо пад фанфары “таинственной тьмы и под шум осеннего свежего ветра”- можна так загрымець з прыступкаў “Добронома”, што дабром гэта ня скончыцца. І тады нават знакаміты хірург з самой Францыі Даніэль Азулай дапамагчы ня зможа. І каму гэта патрэбна? Выпадае так, што мясцовай уладзе. Бо для яе эканомія электраэнергіі важней за здароў’е ці нават жыццё чалавека…

І каго сюды запрасіць у госці ды паказаць усю прыгажосць “начнога пейзажу” асобных участкаў нашага горада? Кадаценку Мікалая? Лічу, што ён і так усё ведае. Хіба што Пятра Рудніка? А мо самога Прэзідэнта Аляксандра Рыгоравіча? Хай бы паглядзеў, як людзі жывуць на перыферыі. Чэрыкаў, зразумела, ня Менск, які купаецца ў промнях электрычных свяцільнікаў. І там нават ноччу дваровае асвятленне не выключаюць, як у Чэрыкаве. Але ж ў малых гарадах нельга так здзеквацца над

(Заканчэнне на стар. 5)

ЗА ОБРАЗОВАНИЕМ НА АВТОБУСЕ

(Оконч. Начало на стр. 3)

вероятных кандидатов на ликвидацию называют школы в Осмоловичах, Макеевичах, Судилах и Гусарке. Также существует мнение о целесообразности закрытия Социально-педагогического центра в Тимоново. Всё это мотивируется необходимостью сокращения расходов районного бюджета, а в качестве альтернативы предлагается перейти на доставку учащихся автобусами. Легко представить, с какими настроениями встретят эту новость в коллективах закрываемых учебных заведений. Тем более что в сегодняшних условиях государство просто не в состоянии помочь с трудоустройством всем желающим.

Тимур НЕЗВАНОВ

НАБАЛЕЛА...

(Заканч. Пачатак на стар. 4)

людзьмі, зневажаць іх, застаўляючы хадзіць у цемры навобмацак. Падаткі ж у працэнтных адносінах людзі ўсюды плоцяць аднолькавыя: што ў сталіцы, што ў правінцыі. Менавіта, для зарплаты нашым чыноўнікам, якія ў сваю чаргу павінны турбавацца аб дабрабыце свайго народа… Нагул, гэты цёмны (я б яго назваў чорны) кут напамінае Чэрыкаў 50-х гадоў, калі лямпачкі мільгалі на адлегласці адна ад другой недзе на паўкіламетра, а мо і болей. Але ж на базарнай плошчы, дзе зараз знаходзіцца крама "Мебель", сталі драўляныя слупы вышынёю каля двух метраў, на якіх былі ўладкаваныя газавыя (керосиновые) ліхтары. І кожны вечар вартаўнік па прозвішчы Аляксанаў, а па нацыянальнасці армянін, які ахоўваў лаўкі на гэтым базары, падстаўляў лесвіцу да слупоў і запалкамі запальваў гэтыя "люстры". Зараз, ня ведаю, як дзе, а ў нас "запальшчык" вулічнага асвятлення, якое ўключаецца ўручную, ціскае кнопку выключальніка. **Прагрэс дваццаць першага стагоддзя!**



Там, дзе добрыя гаспадары ў горадзе ці раёне, месцы, якія наведваюць шмат людзей, імкнуцца добраўпарадкаваць: асвятліць, зрабіць аўтастаянку, добрыя пад'езды. Адным словам, каб чалавеку было зручна прытуліцца…

Падобна на тое, што чэрыкаўшчына вяртаецца ва ўчорашні дзень.

Я цьмяна сабе ўяўляю, як нашы юнакі і дзяўчаты ходзяць у гэты самы бар, які знаходзіцца ў цёмным куту, на дыскатэку. Ці ўжо ў наш час цемра стала сябрам моладзі? Хаця, калі паглядзець з другога боку, куды ж гэтай моладзі падзецца, калі ў нас такія "отцы горада". Прыходзіцца!

Дык можа ўсё ж такі нашым "босам" пара ўжо прачнуцца ад летаргічнай спячкі ды ўбачыць, што на двары ва ўвесь спрыт шугуе дваццаць першае стагоддзе? І што цывілізацыю трэба наводзіць ня толькі на цэнтральных вуліцах, але падумаць і пра "ўзбочыны"! Хаця вуліцы Касманаўтаў ды Калініна ўзбочынай нават з вялікаю натугаю цяжка назваць. Тут знаходзяцца дзржаўныя ўстановы: МНС, Дзяржстрах. Жывуць, ходзяць на працу, у крамы шмат людзей. Сюды прыязджаюць вялікая колькасць вяскоўцаў з раёну.

Не зразумелая для мяне пазіцыя і саміх людзей, якія тут жывуць. Чаму сярод такой колькасці жыхароў ды наведвальнікаў гандлёвых кропак не знайшлося ніводнага чалавека, які пазваніў бы ў адпаведную арганізацыю ці ўстанову ды выказаў агульную скаргу людзей? Патурбаваліся хаця б аб лёсе сваіх дзяцей, якім таксама прыходзіцца ісці дахаты ў цемры, бо зараз дзень адыходзіць рана. Ці ўжо ўсе здранцвелі ад страху? Ці абыякавасць апанавала людзьмі?

Хочацца спадзявацца, што ў рэшце-рэшт кут вуліц Калініна і Касманаўтаў будзе асветлены належным чынам і што вуліца Камсамольская прыме ў цёмны час сутак прывабны выгляд. Студня будзе добраўпарадкаваная і вакол яе з'явяцца ліхтары. А электрычнае святло будзе ўключацца, хоць і ўручную, але ў свой час. Хочацца, каб прыемна было прайсціся па вячэрніх вуліцах нашага горада, каб не было боязна, што ўскочыш у якую-небудзь канаву ці яму. І самае вялікае маё жаданне – каб не было больш патрэбы пісаць на гэтую тэму! **Каб не было больш сітуацыі, пры якой ад бездапаможнасці вырываецца: ЁПРСТ ці нешта іншае!**

Сямён Панізоўцаў

«ХОЗЯИН-БАРИН» БЫХОВСКОГО КОНСЕРВНОГО ЗАВОДА: КОМУ ХОЧУ, ТОМУ ПЛАЧУ

Со сдатчиками сельхозпродукции на Быховском консервном заводе по советской традиции рассчитываются не деньгами, а товаром, преимущественно теми же заводскими консервами. «А что если директору зарплату выдать кабачковой икрой?» – возмущенно интересуются крестьяне, вырастившие для предприятия кабачки. Что такое «передовое предприятие» по-белорусски?

В начале октября райцентр Быхов принимал высоких гостей - председателя концерна «Белгоспищепром» Ивана Данченко, первого заместителя министра торговли Александра Забелло, заместителя председателя Белкоопсоюза Николая Чернышевича, заместителя председателя Могилевского облисполкома Анатолия Исаченко.

Поводом для представительного собрания стал республиканский семинар-совещание с громким названием «О комплексном развитии организаций, производящих плодоовощную консервированную продукцию, и эффективности принимаемых мер по итогам работы за 9 месяцев». Прошло мероприятие на базе ОАО «Быховский консервно-овощесушильный завод» в стиле «взвейся-развейся», по образцу тусовок советских времен, когда достижения били через край, а страна, между тем, трещала по швам.

Что касается достижений, то на словах у Быховского КОСЗ их хоть отбавляй. Тут и двести наименований всевозможной продукции, и экспорт, растущий из года в год, как на дрожжах, и многочисленные награды отечественного пошиба, и масштабная реконструкция, и современные технологии, вроде закатки стеклянной банки под крышку «твист-офф». А уж бойкие заверения руководства предприятия об освоении рынков США, Канады, Китая, Сирии, Иордании и Египта, даже у министров могут вызвать дрожь восхищения.

На самом деле все не так уж и радужно. Начать следует с того, что доминирующих видов продукции у завода всего два: кабачковая икра и зеленый горошек. Причем последний продукт в крупных объемах выпускают еще несколько белорусских заводов, которые вместо того, чтобы завоевывать внешний рынок, львиную долю маркетинговых усилий тратят на конкуренцию между собой. Остальные сто девяносто восемь видов плодоовощных консервов существуют лишь в воспаленном воображении чиновников отечественного пищепрома, привыкших путать свои желания с производственными возможностями.

По самым оптимистичным подсчетам этих самых наименований консервов у ОАО «Быховский консервно-овощесушильный завод» всего-навсего десятка два-три. И это большей частью - различные вариации на темы картошки, капусты и моркови.

Не может не вызвать недоумения и гордость быховских консервщиков своим умением расфасовывать продукцию в жестяную, стеклянную, полимерную тару, под обкатную крышку, крышку «твист-офф» и упаковывать в термоусадочную пленку. На дворе ведь двадцать первый век. Называть сегодня перечисленные технологии передовыми – то же самое, что радоваться приходу стального коня на смену крестьянской лошадке.

К слову и с «масштабной реконструкцией» предприятия, которая началась при одном директоре, велась при втором, а была закончена при третьем, тоже не все гладко. Да, денег в завод было вбухано немало, но каков «выхлоп»? Что дали предприятию новые административное и производственное здания, горы импортного оборудования? Если не считать закредитованности, долговых обязательств перед различными банковскими и хозяйственными структурами – ничего. Главный показатель – объем производства, если и вырос, то несущественно. Спрашивается: а стоило ли огород городить?

Для кого-то – стоило. Ведь вокруг несчастного завода кормится множество контрольных, надконтрольных и околоконтрольных организаций, специализирующихся на статотчетности, выдаче полезных советов и жестких указаний. Благодаря стараниям этой армии бюрократов получается, что если в самом Быхове процветание консервно-овощесушильного завода еще может вызывать сомнения, то на уровне области картинка выглядит уже вполне прилично, а с высоты республиканских небоскребов завоевание рынка США с помощью квашеной капусты вообще кажется делом плевым.

Если быть хоть сколь-нибудь честным, то нельзя не признать: Быховский КОСЗ - классический образец того, как хозяйствовать не следует, яркий образчик консервации затратной экономики советских времен. «Независимо от квалификации директора и степени оснащенности цехов, я могу с предельной точностью предсказать помесячные объемы реализации продукции лет на пять вперед, - признался один из специалистов предприятия, проработавший на заводе больше тридцати лет. – Все зависит от сезона».

Именно так. Убыточность предприятия, перерабатывающего сезонную продукцию, предопределена уже тем, что им руководит не бережливый частник, а государство, заинтересованное лишь в самом факте существования завода. И это прекрасно понимают в администрации ОАО

(Окончание на стр. 7)

«ХОЗЯИН-БАРИН» БЫХОВСКОГО КОНСЕРВНОГО ЗАВОДА: КОМУ ХОЧУ, ТОМУ ПЛАЧУ

(Оконч. Начало на стр. 6)



«Быховский консервно-овощесушильный завод». Что-что, а все нюансы хозяйствования при всеобщей бесхозяйственности ею освоены «от» и «до». Поскольку зарплаты и премии руководства никак не связаны с рентабельностью, то упор делается на внешние, «потемкинские» красоты. На предприятие полно «нововведений» вроде заграничных командировок специалистов высшего звена, пестрых баннеров, камер видеонаблюдения и карт учета прихода-ухода работников.

Методы же работы остались прежними. Заплесневелые и покрытые совковой паутиной, они действуют безотказно. Так, например, со сдатчиками сельхозпродукции на заводе рассчитываются не наличными деньгами, а товаром, преимущественно теми же заводскими консервами. Ходовых продуктов, того же сливочного масла, в фирменном магазине днем с огнем не сыщешь, а сахар появляется лишь по большим праздникам. «А что если директору зарплату выдать кабачковой икрой?» – возмущенно интересуются крестьяне, вырастившие для предприятия кабачки.

Ничего не попишешь. В договорах ведь четко указано, что лишь на продукцию производства Быховского КОСЗ сдатчики могут рассчитывать всегда. Все остальное – по возможности. А ее нет и не предвидится, поскольку знаменитый лейбл «Хозяин-Барин» был и остается не символом рачительности, а иллюстрацией пословицы «Что хочу, то ворочу».

Сергей Антонов

В ХОТИМСКЕ НАЧАЛ СВОЮ РАБОТУ ОФИС ДЕПУТАТА «ГРАЖДАНСКОГО ДОГОВОРА»

В конце октября в городском поселке Хотимск Могилевской области открылся офис депутата «Гражданского договора».

По словам кандидата в депутаты Палаты представителей от кампании «Говори правду» Валерия Коронкевича, сделан важный шаг в организации работы с гражданами, который позволит более полно и всесторонне изучить их проблемы и оказать им посильную помощь.

- Мы планировали открытие офиса на минувшей неделе, однако из-за моей болезни пришлось это мероприятие немного сдвинуть, – рассказывает Валерий Коронкевич. – Открытие офиса депутата «Гражданского договора» позволит нам продолжить свою работу с людьми из Хотимского и соседних районов, изучить их интересы и проблемы, а также оказать посильную помощь в решении наболевших вопросов. Будет организован прием жителей тех районов, которые входили в Кричевский избирательный округ № 83, по которому я выдвигался кандидатом в депутаты, – Хотимского, Кричевского и Климовичского.

Мы будем продолжать то, что делали раньше – помогать решать возникшие у граждан проблемы, собирать подписи под обращениями в местные органы власти, заставлять работать на благо людей чиновников. Безусловно, будем контролировать работу депутатов всех уровней, чтобы они не забывали о нуждах своих избирателей и оказывали им конкретную помощь.

Валерий Коронкевич отмечает, что местные активисты «Говори правду» также планируют активизировать работу по вовлечению в совместную деятельность новых людей.

- Не секрет, что после выборов у людей наступила определенная апатия, – говорит Валерий Коронкевич. – Многие наши активисты подвергались давлению со стороны местных властей, кое-кто отошел от активной деятельности, много людей уехало на заработки в Россию. Сейчас будем прилагать максимум усилий, чтобы через совместную работу с гражданами вовлекать их в активную общественную жизнь. Конечно, трудности будут, но верю, что все у нас получится.

Ирина Беганкина

БОГДАНКЕВИЧ: ПРИ ЭТОЙ ПОЛИТИКЕ МЫ ОБРЕЧЕНЫ



Станислав Богданкевич

Рост цен неизбежно приведет к девальвации и дальнейшему падению уровня жизни белорусов.

Такое мнение в интервью ucpb.org высказал экс-глава Нацбанка Станислав Богданкевич, анализируя нынешнюю ситуацию в экономике и на валютном рынке Беларуси.

Девальвации не избежать

– Девальвация белорусского рубля в условиях, когда растут цены, когда по существу идет галопирующая инфляция, необходима для экономики, поскольку растут издержки на металл, на энергию, на зарплату, – говорит Станислав Богданкевич. – И если выручка по экспорту сохраняется в тех же объемах, что и была раньше, то предприятия будут нести убытки, не будет накоплений для стимулирования труда, для технологического, технического перевооружения. Рост цен обязательно ведет к девальвации. Это можно в какой-то мере сдерживать, когда положительное сальдо торгового баланса. Но у нас в последние месяцы отрицательное сальдо. Особенно платежного баланса. Сегодня власти выкручиваются: берут новые займы у той же России, выпускают ценные бумаги. Но это не может продолжаться долго. Этот год на валютном рынке мы заканчиваем относительно стабильно, но в следующем году девальвацию обязательно прорвет. Она неизбежна.

Мы обречены быть последними в Европе

– Рост зарплат, пенсий и удержание курса рубля создают иллюзию некой стабилизации. В то же время, как показывают исследования, белорусы становятся беднее. По уровню жизни, покупательской способности мы уже в числе самых бедных в Европе. Что впереди?

– Я полагаю, что такое положение будет сохраняться, потому что у нас главная проблема – это проблема эффективности, проблема фондоотдачи, производительности. Ярослав Романчук опубликовал такие данные за 2010 год: объем добавочной стоимости на рабочего у нас составил 10 600 долларов, а в Польше более 26 тысяч долларов. Откуда такая разница? А разница в том, что у нас реформы не идут, что у нас излишняя численность на производстве, вызванная тем, что не происходит технологического, технического перевооружения.

Зарплаты, пенсии увеличиваются, но это не ведет к улучшению уровня жизни, а ведет к галопирующему росту цен на хлеб, на мясомолочные продукты, на товары народного потребления. Видимый рост зарплат в долларовом эквиваленте прекратится уже в следующем году, потому что надо будет выплачивать внешние займы: 3 млрд. госкредитов, более 3 млрд. краткосрочных займов коммерческих банков Беларуси и т.д. Даже если удастся более-менее сбалансировать торговый баланс, будет несбалансированный платежный. Конечно, можно продать какие-то госактивы, заводы и проесть. Но это не может привести к стабильному росту уровня жизни. При этой политике мы обречены находится среди последних по уровню жизни в Европе.

ДЕТИ ДОМА

Дом семейного типа открыли в Черикове 6 ноября, сооющает ТРК “Могилёв”. Четверо детей-сирот обрели новых родителей.

Этот семейный детский дом стал 39-ым подобным заведением на Могилевщине. Кроме этого, в области насчитывается более 1200 опекунских семей, около 700 приемных.

По данным управления образования облисполкома, за 9 месяцев 2012 года родительской опеки лишились на 110 детей меньше, чем в соответствующем прошлогоднем периоде. С 2007 года в области закрыты 6 интернатных учреждений. Основная же задача органов опеки и попечительства – передача детей-сирот на воспитание в замещающие семьи.

КРИМИНАЛ В БЕЛЫНИЧАХ

2 ноября около 12-00 ОГАИ, ИМНС на ул. Задруцкой г.п. Белыничи задержан трактор «МТЗ», под управлением неработающего жителя д. Стехов 1967 г.р., который перевозил около 1 200 кг лома черного металла без соответствующих документов. Металл изъят. Проводится проверка, сообщает uvd.mogilev.by.

магілёўскі **Выбар**

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі

Адрас рэдакцыі: Магілёўская воб, аг-к В. Машчаніца, вул. Савецкая, д.4. Тэл. 8 - 0259 204 308, e-mail: Boris152@gmail.com. Выдавец Міхайлаў Іван Барысавіч. Наклад: 299 асобнікаў, фармат А-4. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 06.11.2012 г. у 20-00.